

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 4 (221) 8 сакавіка 1995 года, серада

*Найлепшыя пажаданні нашым дарагім жанчынам! Няхай яны выбачаюць нас за тое, што мы завалілі ўсю эканоміку і не можам забяспечыць той дабрабыт, якога яны вартыя. Няхай яны заўжды будуць упэўнены, што мы іх кахаем, а гэта важней за ўсялякі дабрабыт.*

Л. КІВАЧ, рэктар
Гродзенскага дзяржаўнага
універсітэта імя Я. Купалы

*Дарагія і мілыя жанчыны!*
*Хачу пажадаць вам самага добрага:*
*ад Бога - здароўя,*
*ад сонейка - цеплыні,*
*ад людзей - дабрыні.*
*Хай у меру радасць, у меру смутак,*
*і няўдач таксама будзе ў меру.*
*І толькі шчасце будзе хай*
*для вас вялікім і бязмерным.*

В. СТАНКЕВІЧ,
дырэктар бібліятэкі

*Мілыя жанчыны!*
*У гэты святочны дзень дарыце мужчынам усмешкі, а вам яны няхай дораць кветкі. Шчасце да вас працягне рукі, калі сэрца добрае ў вас.*

Прафкам

## ВІНШУЕМ !



**Не шкадуйце добрых слоў жанчыне,**
**Стрэўшыся, кажыце ёй часцей**
**Аб яе красе, аб дабраце,**
**Аб вачах яе, чароўных, сініх,**
**З ружай параўноўвайце, з вяргіняй-**
**І яна, як кветка, расцвіце!**

Кастусь ЦВІРКА



## Святочнае прызнанне

*Для мяне жанчына - як мова. Чым больш імкнешся яе пазнаць, тым менш ведаеш.*

*Святочнае пажаданне мужчынам:*

*Не майце памкнення быць абсалютна граматнымі.*

*Шчырае святочнае пажаданне жанчынам:*

*Хай заўсёды каля вас будуць тыя, хто спрабуе спасцігнуць жанчыну, як філолаг імкнецца дасягнуць таямніцаў моўных глыбінь.*

*Вясновай прыгажосці вам, любыя жанчыны, і зорных усмешак вашым вуснам.*

**П. НАВІЦКІ, намеснік дэкана факультэта філалогіі.**

## Што значыць восьмы дзень вясны...
### (ВІНШАВАННЕ З ЛІРЫЧНЫМІ АДСТУПЛЕННЯМІ)

*Што значыць восьмы дзень вясны?*
*Што за таемнасць гэта дата?*
*Чаму прад ёю сняцца сны*
*Ўсе, падобныя на свята?*

*Чаму бунтуе ў жылах кроў,*
*Сэрца не ведае спакою?*
*Бо восьмы дзень вясны прыйшоў*
*З жанчынай боскаю такою.*

*Чаму на сэрцы цеплыня,*
*Якую зразумець не ў сілах?*
*Бо зноў да нас прыйшла вясна,*
*Зачаравала, як узяўчына.*

*Што чары сонца і зямлі*
*Прад сэрцам і вачмі жанчыны?!*
*Як не трымці, а аддасі*
*Сябе ўсяго аж з пупавінай.*

*Ды й гэта толькі на аванс*
*І то, калі яна ў гуморы.*
*Не ўбачыць у профіль і ў анфас,*
*За крыўду спапяліць дакорам.*

*Дзе ў ёй крыніца, дзе выток,*
*У якіх наіў, дабро, бяспечнасць?*
*Адзін глыток, усяго глыток,*
*Каб з ёю, толькі з ёю ў вечнасць!!*



*Не зразумець, не разгадаць*
*Яе не дадзена нам богам,*
*А толькі верыць ёй, кахаць*
*І ўздыхаць аж да знямогі.*

*Жанчына - найтаемны цуд*
*І найчароўнейшая казка,*
*Калі ты ёй і добр, і люб,*
*Яна ўсім сэрцам: «Калі ласка!»*

*І на імгненне ты, як бог,*
*І ўжо назваў яе «сваёю»,*
*Ды саграшыў, згарэў, знямог,*
*Як не жадаў, не перамог,*
*Зноў на каленях перад ёю!*

*А можа, гэта для мужчын*
*Закон зямнога прыцягнення,*
*Не падуладны без жанчын*
*І слоў, што з правіл выключэння:*

*Жанчыну трэба шанаваць,*
*І днём і ноччу цалаваць*
*З душой, ад сэрца, без супынку,*
*Усё жыццё кахаць, кахаць,*
*Таемнасць слодачы спазнаць,*
*Не выпускаючы з абдымкаў.*

**Пятро Маляўка.**

*Сардэчна мы віншуем вас,*
*Жанчыны нашы дарагія,*
*Жадаем поспехаў, каб вас*
*Кахалі шчыра і любілі,*
*Каб ружавелі вашы твары,*
*Усмешка лётала ў вачах,*
*Каб паздзяйсняліся вашы мары,*
*Што часта сняцца па начах.*
*Здароўя вам яшчэ жадаем,*
*А каб аб ім не клапатаць,*
*Мы вам аб спорце нагадаем,*
*Параім, як хваробы гнаць.*
*Прыходзьце вы да нас заўсёды*
*І будзеце мілей за ўсіх,*
*Не папаўнееце ніколі,*
*Здароўя хопіць на дваіх.*
*Цудоўна вам яшчэ жадаем*
*Правесці свой жаночы дзень.*
*Няхай наш свет вам будзе раем,*
*Не назаўжды, дык хоць на дзень.*

**Мужчыны факультэта фізічнай культуры, кафедры фізвыхавання і спартыўнага клуба.**

*Я щедро Вам*
*Любовь свою дарю,*
*Возьмите Вы в сердца ее -*
*Не в руки,*
*Пусть я всегда*
*От этой правды-муки*
*Страдаю,*
*Но, запомните, - горю.*

**М.СПОРНІК, доктар тэхнічных навук, прафесар.**

*Прысвячаецца цудоўнай палове чалавецтва, асабліва дзяўчатам 3 групы 5 курса матфака.*

*Мілыя дамы нашых абцудных сэрцаў! З усёй матэматычнай прамалінейнасцю прыносім нашы непарыўныя віншаванні з нагоды самага прыемнага для вас свята - 8 Сакавіка! Жадаем, каб размеркаванне шчасця ў вас складалася з адных максімумаў і імкнулася б да бесканечнасці!*

**Моцная палова 5 курса матфака (асабліва 3 групы).**

# «УЗРОВЕНЬ ГРАМАДСТВА ВЫЗНАЧАЕЦЦА ПАВАГАЙ ДА ЖАНЧЫНЫ...»



**Святлана Піліпаўна Мусіенка, загадчыца кафедры польскай філалогіі,-паважаны чалавек ва універсітэце, яе добра ведаюць у рэспубліцы і далёка за яе межамі. Яна - цудоўны педагог, карыстаецца любоўю і павагай сярод студэнтаў і калег па працы, таленавіты вучоны-паланіст, абараніла доктарскую дысертацыю па тэме «Польскі раман 20-30 гадоў», якая абагульняе вопыт развіцця польскага рамана.**

**Святлана Піліпаўна амаль напярэдадні свята жанчын атрымала прафесарскі атэстат па польскай філалогіі, дарэчы, першы ў Беларусі. Шчыра віншуем Святлану Піліпаўну з гэтай нагоды і жадаем плёну ў працы, шчасця ў жыцці, здзяйснення самых запаветных мараў!**

**Сёння С.П. Мусіенка - жаданы госць рэдакцыі - шчыра расказвае аб сабе.**



- Па-першае, я ўдзячна ўсім за віншаванні ў мой адрас. Прыемна і індывідуальна за сябе, і за універсітэт увогуле, бо атэстат прафесара прадстаўляе універсітэт. У нас упершыню створана кафедра польскай філалогіі, літаратурны музей Зофьі Налкоўскай (дарэчы, ён быў адкрыты раней, чым у Польшчы), багатая бібліятэка польскай літаратуры - гэтым універсітэт можа ганарыцца. Кафедрай польскай філалогіі праведзены тры міжнародныя канферэнцыі.

***- Святлана Піліпаўна, атэстат прафесара абавязвае?***

- Канешне. Але я заўсёды старалася быць на сваім месцы, сур'ёзна ставіцца да працы. І атэстат - гэта вынік працы, працы катаржнай і вельмі цудоўнай, гэта дасягненне майстэрства. Я бязмежна ўдзячна свайму настаўніку Віктару Аляксандравічу Хораву, самаму, на мой погляд, выдатнаму, вядомаму паланісту, віцэ-дырэктару Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай Акадэміі навук.Менавіта ён вывеў мяне на навуковы шлях, кансультаваў у працэсе працы над доктарскай дысертацыяй, дапамагаў парадамі. Нашы выпускнікі, між іншым, сёння - яго аспіранты.

***- Кафедра польскай філалогіі - адзіная ў Беларусі. З якімі вну вы супрацоўнічаеце?***

- На сённяшні дзень мы наладзілі сувязі з 3 цэнтрамі: Вышэйшай педагагічнай школай у Кракаве, Гданьскім універсітэтам і Расійскай Акадэміяй навук па тэме польскай літаратуры і па беларуска-польска-рускіх літаратурна-лінгвістычных сувязях. Тэма даследавання аб'яднала намаганні вучоных кафедры універсітэта і трох цэнтраў. Працуем па 3 кірунках: навуковы (даследуем алегарычную прозу польскай літаратуры, вывучаем польскую фантастыку, прозу маладой Польшчы, польскую літаратуру ў гродзенскім рэгіёне, беларускую тэматыку ў польскай літаратуры), дыдактычны і студэнцкія практыкі. Мы выпусцілі два зборнікі: « Зофье Налковской посвящается» і «Od strony kresow». Рыхтуецца да друку трэці - «Печальная судьба». Ён ужо набраны ў выдавецтве «Полымя», але, на жаль, няма грошай, каб яго выкупіць. Плануем таксама да 75-годдзя А.Карпюка прапанаваць чытачам новы зборнік. Спадзяемся, што універсітэт не затрымае яго выпуск.

***- Цікава даведацца, адкуль вы родам, дзе вучыліся, працавалі?***

- Вучыцца пачала рана, дзеля гэтага прыехала з Данецку ў Мінск у БДУ на філалагічны факультэт. У значнай ступені мне дапамагла маці ў выбары шляха жыцця, яна была надзвычай добрым чалавекам. Увогуле я ўпэўнена, што бацькі рыхтуюць чалавека да жыцця, традыцыі сям'і павінны быць мацней за вуліцу. Пасля Мінска - Маскоўскі універсітэт. Чаму менавіта польская літаратура? Мне заўжды падабалася замежная літаратура, а асабліва польскі аўтар Б.Прус. Па мастацкаму ўзроўню ў польскай літаратуры аўтарытэта для мяне больш няма, немагчыма знайсці дзеяча культуры, які б дасягнуў такой дасканаласці ў выкарыстанні вытанчанага, празрыстага стылю. Б. Прус дапамог мне выйсці ў польскую літаратуру.

Потым - аспірантура: у БДУ, Акадэміі навук СССР, Варшаўскім універсітэце.

Друкавалася ў савецкіх, беларускіх, польскіх часопісах,многіх міжнародных зборніках, удзельнічала ў 20 міжнародных канферэнцыях, у 9-м кангрэсе паланістаў. Друкавалася на чатырох мовах, маю каля 70 публікацый. Цяпер і свабоднай хвіліны няма: лекцыі, семінарскія заняткі, аспірантура.

***- Ці хапае на ўсё часу? Калі з'яўляецца вольны час, чым тады займаецеся?***

- Бывае, што мала 24 гадзін у суткі. Але жыццё - рэч складаная,і калі чалавек не развіваецца духоўна, не цікавіцца літаратурай, музыкай, напрыклад, ён не стане тым чалавекам, якім ён павінен быць.

Люблю лес, музыку. Люблю прымаць гасцей. Сама гатую. Прыемна, калі мая ежа падабаецца ўсім, як і мае навуковыя працы. І імкнуся рабіць такім чынам, каб маімі гасцямі былі тыя людзі, з якімі цёпла і цікава.І ім павінна быць прыемна са мной.

***- А якой музыцы вы аддаеце перавагу?***

- Люблю Моцарта «Волшебную флейту», Чайкоўскага «Зимние грезы», Грыга «Пер Гюнт». Лепшай лічу карціну «Девочка на шаре» Пікасо.

***- Якая ваша любімая кніга, тая, якую вы можаце перачытваць шмат разоў?***

- Цяжка выдзеліць адну. Не аднойчы вяртаюся да «Мастера и Маргариты» М.Булгакава, Б. Пруса, М. Багдановіча, А.Сент-Экзюпеpы. У мяне ёсць любімыя людзі, музычныя творы, ёсць і любімыя кветкі, але толькі жывыя. У вазонах яны - як жывёлы ў заапарку.

***-Ва ўсіх людзей, хто вас ведае, вы карыстаецеся рэпутацыяй жанчыны, якая пры любых абставінах выглядае, што называецца, на ўсе сто і гэта пры выдатных дзелавых якасцях, выключнай кантактнасці і добразычлівых адносінах да людзей. Скажыце, калі ласка, як вам удалося захаваць маладосць і прыгажосць?***

- Прыродная прыгажосць ад Бога і ад бацькоў. Я практычна не карыстаюся касметыкай.

***- Якую жаночую якасць вы лічыце лепшай?***

- Жаноцкасць, а ў мужчын - 4 якасці: розум (інтэлект), сіла, рыцарства і павага да жанчыны. Узровень грамадства вызначаецца павагай да жанчыны і яе месцам у грамадстве. Вышэйшыя прыступкі ўлады займаюць, на жаль, мужчыны. І ў гэтым Гродзенскі універсітэт таксама не выключэнне.

***- 8 Сакавіка - цудоўнае свята: абуджаецца прырода, чалавечыя пачуцці. Што б вы хацелі пажадаць сваім калегам і выхаванцам у гэты дзень? Што хацелі б параіць мужчынам?***

- Мілыя жанчыны! Заставайцеся заўсёды абаяльнымі, прывабнымі, пяшчотнымі, нават у наш суровы час, захоўвайце ўменне падабацца мужчынам, таму што свет ад гэтага стане толькі цяплейшым.

Паважаныя мужчыны! Зрабіце так, каб кожны дзень жанчына адчувала, што менавіта сёння - 8 Сакавіка.

Дарагія дзяўчаты-студэнткі! Жадаю шчасця, поспехаў і найдалей заставацца маладымі!

***- І традыцыйнае пытанне. Вашы планы?***

- Я як жанчына планаў баюся. Але хацелася б больш цеснага і больш шырокага ў навуковым плане супрацоўніцтва з цікавымі навуковымі цэнтрамі, каб мае вучні хутчэй абаранілі дысертацыі, каб усім-усім стала лягчэй, каб з'явілася надзея на лепшае жыццё.

Мужчыны кожны дзень павінны памятаць, што з імі побач жывуць і працуюць жанчыны.

***Гутарку вяла Н.ПЯТРОВА.***



# ENGLISH CLUB

**Англійскі клуб шчыра адчыніў дзверы для ўсіх тых, хто захапляецца англійскай мовай, 23 сакавіка 1994 года. Сёння арганізатары і аматары клуба, дарэчы, цудоўныя жанчыны Л.М. Серада, Г.У.Ігнацьева, Л.А. Гусакоўская і іншыя, святкуюць гадавіну з дня яго нараджэння.**

**Віншуем іх і са святам 8 сакавіка з пажаданнямі здзяйснення іх планаў.**

Адкрыццё англійскага клуба ў Гродне было звязана з прыездам у Беларусь амерыканскіх грамадзянаў Тэа і Вольгі Райс, якія праводзілі семінар па асновах бізнэса ў Мінску. Бацькі Вольгі - беларускага паходжання, і Вольга з Тэа пасля выхаду на пенсію вырашылі зрабіць штосьці добрае для Беларусі. Яны пачалі збіраць літаратуру на англійскай мове - мастацкую, энцыклапедыі, кнігі па розных галінах ведаў - і зрабілі такі падарунак у Брэст для абласной дзіцячай бібліятэкі. І ў Гродна трапіла пэўная колькасць кнігаў са ЗША. З дазволу загадчыка аддзела культуры гарвыканкама І.І.Кліменка іх гасцінна прытуліла дзіцячая бібліятэка па пр. Касманаўтаў, 4а. Там можна карыстацца імі і дагэтуль.

Ідэя адкрыцця клуба для маладых людзей, якіх аб'ядноўвае захапленне англійскай мовай, усім спадабалася. Адкрыццё клуба адбылося ў гэтым жа памяшканні бібліятэкі па пр. Касманаўтаў 23 сакавіка 1994 года ў дзень 430-й гадавіны з дня нараджэння вялікага англійскага паэта і драматурга Уільяма Шэкспіра. Гучалі санеты Шэкспіра на мове арыгінала, іх пераклады, музычныя творы, было зроблена паведамленне аб біяграфіі паэта, праведзены віктарыны. У вечарыне прынялі актыўны ўдзел студэнты ГрДУ, выкладчыкі і старшакласнікі СШ N 14.



У гэтым навучальным годзе адкрыццё клуба ўрачыста пачалося вечарынай-канцэртам 18 кастрычніка ў актавай зале універсітэта. У гэты дзень Вольга і Тэа Райс прывезлі ў Гродна пры дапамозе фонда Сораса 12 вялікіх скрыняў з літаратурай. Госці былі ўзрушаны самадзейнасцю на англійскай мове: гучалі песні, вершы, адбыліся сустрэчы з героямі вядомых мастацкіх твораў у выкананні студэнтаў II і III курсаў гістарычнага факультэта аддзялення МЭА, А. Садоўскага - студэнта V курса матэматычнага факультэта, А. Блоцкага - студэнта медыцынскага інстытута. Прывіталі клуб і школьнікі СШ N 14, і дырэктар філіі Мінскага культурнага асветніцкага цэнтра С.А.Іоська, і ўдзельнікі студэнцкага тэатра «Вернісаж» Я. Праспураў і В. Ляховіч, і школьнікі 30-й школы-гімназіі. Гэта было сапраўднае свята англійскай мовы. Цяпер удзельнікамі клуба з'яўляюцца каля 80 чалавек.

Цікавая вечарына, прысвечаная калядным святам, адбылася 23 снежня. Студэнты IV курса гістарычнага факультэта падрыхтавалі і ажыццявілі пастаноўку спектакля па матывах казкі пра Беласнежку і гномаў. Гучала нямала знакамітага англійскага гумару, аздобленага студэнцкім.

Адным з цікавых гасцей клуба была дацэнт кафедры філасофіі Л.А. Гусакоўская. У час наведвання Англіі яна зрабіла шэраг цікавых матэрыялаў аб знакамітых лонданскіх мясцінах, шматлікіх музеях.

У планах клуба - іншыя



сустрэчы з замежнымі грамадзянамі. Дарэчы, член савета клуба, выкладчык мединстытута І.Р. Стэмпень праводзіць агляд новых відэафільмаў па пятніцах у памяшканні мединстытута. Шчыра запрашаем усіх, каму падабаецца карыстацца англійскай мовай, знайсці сяброў па агульнаму захапленню, наведаць Англійскі клуб.

Але, на жаль, у клуба ёсць і шэраг праблемаў. Самая галоўная - мы апынуліся без сталага памяшкання. У нас няма магчымасці паказаць эмблему клуба, няма дзе размясціць літаратуру. Магчымасці няма, але ёсць шмат энтузіязма ў аматараў англійскай мовы.

*Л. СЕРАДА, дацэнт кафедры замежных моваў.*

**НА ЗДЫМКАХ: Л.М.СЕРАДА; на сцэне - казка.**

# АХОЎВАЕМ ПТУШАК

Заходне-Беларускае таварыства аховы птушак (ЗБТАП) створана ў 1993 годзе фактычна пры біялагічным факультэце нашага універсітэта. Гэта добраахвотная арганізацыя, і ў яе рабоце ўдзельнічаюць, акрамя студэнтаў, аматары-арнітолагі з усёй Беларусі, а таксама юннаты гродзенскіх школ.

У мінулым годзе арнітолагі працавалі па двух праектах на тэрыторыі нашай вобласці.

У мэтах стварэння першага ў рэспубліцы рэгіянальнага Атласа гняздуючыхся птушак быў даследаваны Гродзенскі раён. Студэнты біяфака Ірына Дзямешчык і Аляксандр Пляскайціс знайшлі гняздо рэдкай птушкі Беларусі - чырвонага каршуна. Гэта першае гняздо, знойдзенае ў рэспубліцы за апошнія 40 гадоў.

Трэба сказаць, што птушкі ў Беларусі вывучаны вельмі дрэнна. І невядома, колькі адкрыццяў для арнітолагаў утойваюць яшчэ яе прасторы. Метадычным вывучэннем птушак у вобласці і займаюцца сябры ЗБТАП. Акрамя каршуна, сенсацыяй для работнікаў аховы прыроды дзяржаўнай інспекцыі з'явіліся новыя месцы гняздоўяў буслоў, жураўлёў і іншых птушак. І гэта толькі ў адным раёне! Шмат яшчэ цікавага прынясуць вяснова-летнія экспедыцыі студэнтам - членам ЗБТАП.

Група студэнтаў біяфака ў рамках праекта ЗБТАП займалася мінулым летам выратаваннем выводкаў балотнага мышалова. Ранняя жатва забірае амаль палову птушанят, якія яшчэ не ўмеюць лятаць. Студэнты Д.Вінчэўскі і А.Ясевіч выратоўвалі іх, дамаўляючыся з камбайнерамі і брыгадзірамі. Усяго імі было выратавана 12 птушак і 2 адкладванні лугавых мышаловаў.

Выкананне абодвух гэтых праектаў у 1994 годзе стала магчымым дзякуючы падтрымцы Паўночна-Падляскага Таварыства аховы птушак (ППТАП, Польшча).

Мы запрашаем жадаючых удзельнічаць у нашых акцыях, а таксама тых, хто хоча проста больш даведацца аб прыродзе. Звяртайцеся на кафедру батанікі і заалогіі біялагічнага факультэта ў аўдыторыю 318 ці па тэлефоне 31-68-96 да выкладчыка А. Вінчэўскага.

*А. ВІНЧЭЎСКІ, прэзідэнт Заходне-Беларускага таварыства аховы птушак.*



# ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Штогадова на працягу апошніх гадоў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы з'яўляўся базавым для правядзення агляду-конкурсаў на лепшую навуковую працу студэнтаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках у галіне філалагічных і юрыдычных навук. За апошнія два гады ў конкурсе прынялі ўдзел 60 студэнцкіх навуковых прац, з якіх 2 працы былі адхілены. Усяго ўзнагароджанымі з'явіліся 24 навуковыя працы, з якіх Дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі з прэміяй - 6 прац, Дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі - 8 прац, Дыпломамі БРС НДРС - 10 прац.

Аўтары лепшых студэнцкіх навуковых прац былі ўзнагароджаны кожны ў памеры месячнай стыпендыі за кошт стыпендыяльнага фонду універсітэта. Імі з'явіліся:

- *Савушкіна Алена Васілеўна* і яе праца «Развитие межличностных взаимоотношений в младшем школьном возрасте»;
- *Папко Іна Валер'еўна* і яе праца «Капыль: гісторыка-эканамічны нарыс»;
- *Лісоцкі Сяргей Аляксеевіч* і яго праца «Современные проблемы государственного суверенитета Республики Беларусь»;
- *Токць Сяргей Міхайлавіч* і яго праца «Деятельность графа М.И. Муравьева по реализации политики царизма»;
- *Белазаровіч Віктар Аляксандравіч* і яго праца «Лунно: историко-экономический очерк (досоветский период)»;
- *Кашко Сяргей Леанідавіч* і яго праца «Деятельность благотворительных учреждений и организаций в Гродненской губернии в XIX-XX веках»;
- *Валюшка Алена Леанідаўна* і яе праца «Диагностика и коррекция понимания первоклассниками внутрисемейных отношений»;
- *Карпенка Марына Вячаславаўна* і яе праца «Детский фольклор и его использование на уроках в младших классах общеобразовательной школы»;
- *Астравух Нона Эдмундаўна* і яе праца «Углубление художественного анализа судеб рядовых в одноименной пьесе Алексея Дударева»;
- *Кулеш Віталь Эдуардавіч* і яго праца «Способы должностных хищений в банковской системе. Методы их обнаружения и расследования»;
- *Шыкас Вольга Іванаўна* і яе праца «Общая характеристика гражданского права Российской империи конца XIX - начала XX веков»;
- *Бакун Марына Іванаўна* і яе праца «Влияние радионуклидов на активность креатинкиназы в тканях крыс»;
- *Ільенка Святлана Мікалаеўна* і яе праца «Выделение, очистка и частичная характеристика бромпероксидазы»;
- *Камінская Ганна Станіславаўна* і яе праца «Выделение, очистка и частичная характеристика хромпероксидазы»;
- *Сямёнчык Міхась Балеслававіч* і яго праца «Формирование промышленного пролетариата Гродненской губернии в 60-90 гг. XIX в.»;
- *Парышчэнкава Таццяна Іванаўна* і яе праца «К.Паустовский и музыка»;
- *Пацяна Юры Віктаравіч* і яго праца «Эстетические взгляды М.Богдановича»;
- *Петушок Наталля Эдуардаўна* і яе праца «Влияние внутреннего облучения на процессы перикисного окисления липидов в различных тканях крыс».

Таксама нароўні з аўтарамі лепшых студэнцкіх навуковых прац былі ўзнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі РБ і прэміраваны за кошт бюджэту ў памеры 100 000 рублёў навуковыя кіраўнікі вышэйадзначаных студэнцкіх навуковых прац. Імі з'явіліся:

- *Крэнь Іван Платонавіч*, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі;
- *Фёдараў Ігар Алегавіч*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;
- *Паўлючэнка Ніна Уладзіміраўна*, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі;
- *Караў Дзмітры Уладзіміравіч*, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі;
- *Калеснікаў Валеры Васілевіч*, дацэнт кафедры дзяржаўнага, працоўнага і сельскагаспадарчага права;
- *Зорын Георгі Аляксеевіч*, прафесар, загадчык кафедры крымінальнага права, працэсу і крыміналістыкі;
- *Місцюк Вера Антонаўна*, дацэнт, загадчык кафедры музыкі і методыкі музычнай адукацыі;
- *Родзік Надзея Іванаўна*, ст. выкладчык кафедры псіхалогіі і педагогікі пачатковага навучання;
- *Аўтуховіч Таццяна Яўгенаўна*, дацэнт кафедры рускай і замежнай літаратуры;
- *Бурдзь Васіль Мікалаевіч*, дацэнт кафедры біяхіміі і біятэхналогіі;
- *Мандрык Канстанцін Аляксандравіч*, дацэнт, загадчык кафедры анатоміі і фізіялогіі чалавека;
- *Галіцкі Эдуард Аляксеевіч*, дацэнт кафедры анатоміі і фізіялогіі чалавека.

Не засталіся без увагі і арганізатары конкурсных камісій па філалагічных і юрыдычных навуках. Яны былі таксама ўзнагароджаны Дыпломамі Міністэрства адукацыі і навукі РБ і прэміраваны за паспяхова праведзенне, патрабавальны прафесійны ўзровень і бліскучую арганізацыю конкурсаў. Гэта:

- *Антонава Святлана Міхайлаўна*, дацэнт кафедры рускай мовы, старшыня конкурснай камісіі па філалагічных навуках;
- *Смольская Людзміла Ігнатаўна*, дацэнт кафедры рускай мовы, адказны сакратар конкурснай камісіі па філалагічных навуках;
- *Пячэрскі Уладзімір Уладзіміравіч*, старшыня конкурснай камісіі па юрыдычных навуках;
- *Максімава Людзміла Рыгораўна*, выкладчык кафедры грамадзянскага права і працэсу, адказны сакратар конкурснай камісіі па юрыдычных навуках.

Выражаем асаблівую падзяку дэканам факультэтаў, якія арганізавалі своечасовае накіраванне студэнцкіх навуковых прац для ўдзелу ў конкурсах, забяспечылі неабходны навуковы ўзровень прац сваіх навучэнцаў праз патрабавальную і бліскучую прафесійную арганізацыю навучальнага і навуковага працэсаў на сваіх факультэтах:

- *Чарапіцы Валерыю Мікалаевічу*, дэкану факультэта гісторыі і культуры;
- *Гушчыну Івану Віталевічу*, дэкану факультэта права і эканомікі;
- *Паўловіч Наталлі Васілеўне*, дэкану факультэта біялогіі і экалогіі;
- *Рычковай Людзміле Васілеўне*, дэкану факультэта замежных моваў;
- *Таранцею Віктару Пятровічу*, дэкану факультэта педагогікі і псіхалогіі;
- *Жуку Ігару Васілевічу*, дэкану філалагічнага факультэта.

Сардэчна віншуем усіх удзельнікаў конкурсаў 1992/93 і 1993/94 навучальных гадоў на лепшыя навуковыя студэнцкія працы па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках; навуковых кіраўнікоў лепшых студэнцкіх навуковых прац, аўтараў лепшых студэнцкіх навуковых прац, старшынь конкурсных камісій і адказных сакратароў конкурсных камісій.

# ТАБЛО АЛІМПІЯДАЎ

● 19 снежня на факультэце замежных моваў адбылася алімпіяда па рускай мове. У ёй прынялі ўдзел 34 чалавекі.

У шасцёрку пераможцаў увайшлі студэнты III і I курсаў. Апошняе асабліва прыемна, таму што частка заданняў алімпіяды была звязана з гісторыяй мовы, стылістыкай, сінтаксісам - прадметамі, якія вывучаюцца не на малодшых курсах.

Першае месца заняла ***Таццяна Сямёнава***, студэнтка 2 групы III курса. Яна набрала 12,5 бала. На другім месцы - ***Алена Палявая,*** студэнтка I групы III курса ( 11 балаў), на трэцім месцы - ***Алена Разава,*** студэнтка I групы III курса ( 10,5 бала).

● 20 снежня 1994 года адбыўся універсітэцкі тур алімпіяды па рускай літаратуры, у якім прынялі ўдзел 35 студэнтаў II-V курсаў факультэта замежных моваў. Заданні былі дыферэнцаваны па курсах адпаведна аб'ёму літаратурнай падрыхтоўкі студэнтаў, пры гэтым яны змяшчалі па 3 пытанні: адзін - па гісторыі літаратуры, адзін - па агульнаму літаратуразнаўству і адзін, разлічаны на дасціпнасць і вынаходлівасць студэнтаў. У выніку лепшую падрыхтоўку прадэманстравалі студэнты III-IV курсаў - ***Алена Разава, Вольга Сарокіна і Таццяна Сямёнава***. II і V курсы не мелі яўных лідэраў. Відавочна, «навабранцы» яшчэ не ўцягнуліся, а «ветэраны» дачасна заставілі навуковую трасу. Таму кафедры рускай і замежнай літаратуры патрэбна зрабіць адпаведныя высновы.

● На I курсе факультэта замежных моваў кафедрай замежных моваў была праведзена алімпіяда па спецыяльнасцях «Англійская мова», «Нямецкая мова» і «Французская мова». У ходзе алімпіяды былі выяўлены студенты, прадэманстраваўшыя найлепшае валоданне вымаўленнем вывучаемых імі моваў. Пераможцы і актыўныя ўдзельнікі алімпіяды па кожнаму з прадметаў былі ўзнагароджаны грашовымі прэміямі ці адмечаны распараджэннем па факультэту аб абвяшчэнні падзякі.

Першыя месцы занялі: ***Антаніна Крывашчокая*** (6 група) - англійская мова, ***Аляксандр Разніцын*** (5 група) - нямецкая мова, ***Віктар Ганускa*** (4 група) - французская мова.

Алімпіяда выявіла, што студэнты факультэта праяўляюць вялікі інтарэс да набыцця трывалых ведаў і актыўна ўдзельнічаюць у такіх мерапрыемствах. Членам журы было вельмі складана выявіць пераможцаў, таму што ўзровень падрыхтоўкі ўсіх удзельнікаў алімпіяды быў дастаткова высокім.

# Майстар



Лёс падараваў мне шчаслівыя дні, а дакладней - 4 месяцы, 4 месяцы вяртання ў сцены Беларускай Акадэміі мастацтваў. З 17 кастрычніка па 17 лютага ў мяне праходзіла там стажыроўка.

Якая ты сёння, мая alma mater? Што ў цябе засталося ад той, з 70-х, і што да цябе прыйшло з гэтых, 90-х? У 1995 годзе табе - 50.

З дрыжыкамі ў целе адчыняю дзверы... Вось яна, мармуровая лесвіца, прыглушаны свет у калідоры, аўдыторыі... У памяці адзін за адным усплываюць твары аднакурснікаў і выкладчыкаў. За 50 гадоў у гэтых сценах сфармавалася школа сучаснага беларускага мастацтва, якая на сённяшні дзень з'яўляецца адной з мацнейшых мастацкіх школ Еўропы. Адзін з заснавальнікаў гэтай школы - мой настаўнік, а падчас стажыроўкі - мой кіраўнік, народны мастак Беларусі, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, прафесар Г.Х.Вашчанка.

Даўно мы не бачыліся, але звесткі аб творчых поспехах Майстра даходзяць да мяне з газет, часопісаў, радыё, тэлебачання, выстаў. Апошняя навіна пра Вашчанку ўзрушае. Оксфардскі універсітэт называе яго сярод 500 імёнаў лепшых мастакоў свету 20 стагоддзя.

... А памяць вядзе назад, на ўступныя экзамены ў Акадэмію, а тады, у 1971, - тэатральна-мастацкі інстытут. Экзамен па кампазіцыі, які заканчваў спецыяльныя дысцыпліны... Сярод абітурыентаў, якія ўжо неаднаразова паступалі ў інстытут, хадзіла чутка, што калі Вашчанка на апошнім экзамене падсядаў да якога-небудзь абітурыента і назіраў за яго работай, адначасова размаўляючы з ім, то той абавязкова станавіўся студэнтам. Я быў ў ліку шчаслівчыкаў.

Сёння я зноў прыехаў павучыцца ў Вашчанкі-Майстра і Вашчанкі-выкладчыка. На праглядзе студэнцкіх работ адкрываю для сябе яшчэ раз Вашчанку-педагога: наколькі ён востра адчувае ідэю вобраза кожнай студэнцкай работы, як ён бачыць яе развіццё і яе межы. Гэта было і тады, у 70-х, але студэнцкая «геніяльнасць» пярэчыла мне, маім аднакурснікам да канца зразумець і ўспрыняць яго заўвагі.

Мае адкрыцці Гаўрыіла Харытонавіча працягваюцца ў яго майстэрні. З вялікай цікавасцю разглядаю яго новыя карціны і заўважаю, што, нягледзячы на ўзрост і вядомасць, мастак не стаў кансерватыўным. Ён не эксплуатуе адну і тую ж тэму на працягу ўсяго творчага жыцця, а пастаянна знаходзіцца ў пошуку і даследаванні новых тэм, вобразнай пластыкі і тэхнічных прыёмаў. Дзялюся з ім сваімі творчымі, педагагічнымі задумкамі і знаходжу ў Майстра разуменне і падтрымку.

***М.БАНДАРЧУК, сябра Саюза мастакоў Беларусі, прафесар кафедры выяўленчага мастацтва Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.***

**НА ЗДЫМКУ: Г.Х.ВАШЧАНКА ў сваёй майстэрні.**

## На музейна-экскурсійнай практыцы

Кафедра гісторыі Беларусі ўжо каторы год запар арганізуе музейна-экскурсійную практыку са студэнтамі ІІ курса. Патрэбнасць у такой практыцы прадыктавана неабходнасцю даць рознабаковую падрыхтоўку будучым спецыялістам-гісторыкам, пашырыць іх гістарычны кругагляд, заахвоціць да больш глыбокага вывучэння спадчыны нашага народа.

На кафедры ў гэтым плане назапашаны пэўны станоўчы вопыт.У свой час базай практыкі былі музеі Ленінграда. На жаль, гэтае ўжо ў мінулым. Два гады таму кафедрай была зроблена пераарыентацыя на Мінск. І цяпер студэнты факультэта ў час зімовых канікул наведваюць музеі, знаёмяцца з архітэктурнымі помнікамі сталіцы.

На гэты раз актыўную дапамогу ў правядзенні практыкі аказаў Беларускі інстытут праблем культуры, супрацоўнікі якога забяспечылі правядзенне тэарэтычных і практычных заняткаў. Спецкурс «Асновы музеязнаўства» быў прачытаны дацэнтам кафедры кіравання БелІПК, дырэктарам гісторыка-культурнага запаведніка «Заслаўе» Каўбаскай А.М.

Цікавымі і змястоўнымі былі экскурсіі ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры, Нацыянальны мастацкі музей, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, мемарыяльныя музеі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Беларускую хатку».

Наведванне музеяў суправаджалася знаёмствам з іх фондамі, прыёмамі пабудовы экспазіцыі, экскурсійнай працай.

Такая практыка, несумненна, дасць у будучым для студэнтаў свае плённыя вынікі.

На пасяджэнні кафедры 22 лютага падведзены папярэднія вынікі (10 сакавіка - выніковая канферэнцыя). Вырашана распрацаваць новыя падыходы і праграмы практыкі з улікам таго, што яна будзе праводзіцца на базе гродзенскіх музеяў. Асноўнае месца ў праграме адводзіцца праблемам практычнага плану, да вырашэння якіх будуць прыцягнуты супрацоўнікі музеяў і выкладчыкі кафедры, а таксама вядучыя спецыялісты ў галіне музеязнаўства з рэспублікі.

***Э. ЯРМУСІК, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.***

## Навуковая канферэнцыя ў Гродне

16 лютага ў Гродне адбылася навуковая рэспубліканская канферэнцыя «Беларускія каталіцкія святары і нацыянальнае адраджэнне пачатку XX стагоддзя». Прысвечана яна была 105 угодкам з дня нараджэння выдатнага беларускага дзеяча, ксяндза і паэта Казіміра Сваяка (1890-1926). Арганізаваў канферэнцыю Беларускі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі сумесна з Гродзенскай абласной філіяй фонду імя Льва Сапегі. Праводзілася акцыя ў будынку музея гісторыі рэлігіі. Удзел у ёй бралі каталіцкія святары, навукоўцы з Гродна і Мінску. Апроч іх таксама прысутнічалі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі і прэсы.

На ранішнім пасяджэнні было зачытана 9 дакладаў. Датычыліся яны жыцця і дзейнасці К.Сваяка, творчасці іншых беларускіх ксяндзоў-паэтаў, гісторыі развіцця беларускага хрысціянскага руху. Асабліва хочацца адзначыць выступы сп. В.Рудніка «Жыццёвы шлях К.Сваяка», сп. Д.Бічэль-Загнетавай «Паэтычная творчасць і філасофскія погляды Казіміра Сваяка», сп. Я. Трацяка «Каталіцкі касцёл і нацыянальная палітыка».

У другой палове дня ў будынку музея Максіма Багдановіча адбылася змястоўная дыскусія па праблемах гісторыі і сучаснага стану беларускай справы ў каталіцкім касцёле.

Дадамо, што гэта была першая канферэнцыя, прысвечаная гісторыі беларускага каталіцкага руху. Прайшла яна надзвычай удала.

***Э.МАЗЬКО.***



# НАТХНЕННЕ

## *Едрусь МАЗЬКО*

***

ты адыдзеш
як бераг адыходзіць ад мора
як зоркі гаснуць у халодным
небакраі
і ты сплывеш
як карабель апошні
з зялёным ветразем сплывае
у далячынь
каб болей не вярнуцца
ты адыдзеш
як адыходзяць людзі
не развітаўшыся
ў расплюшчаны нябыт
дзе спеў змаўкае перад
навальніцай
і жаваронак памірае ад тугі
ты адыдзеш
туды, дзе вечны змрок
сваё рассее пустазелле
па берагах няўлоўнае ракі
і дзе, мяне ты не сустрэнеш,
не спаткаеш
у час,
калі Плутон развешвае сцягі

***

і ў сне жахлівым
не прымрою,
што ты пакінула мяне
і што парфянскаю стралою
твой ліст на стол мой упадзе
і я, паранены табою,
без сіл і волі да жыцця
зыду атрутнаю крывёю
ў сузор'і мужнага Стральца

### Развітальнае

**Невынішчальнаму Скарпіёну**

... а мой цягнік спяшаецца
ў дарогу,
ажно дрыжыць, бы ў трансе
наркаман
і праваднік збірае ля парога
квіткі, нібы даніну цюркскі
хан
я ад'язджаю. Тлумная сталіца
вас праглыне. Адно таемны
знак
пакінуць ногі ў асфальтовай
піццы:
«Спаткаецеся ў бары
«Задыяк».

### С.

у моры спакою - ты зорка
Млечнага шляху
а дрэвы - яны не жывыя,
бо не маюць сэрца
дурное лісце шапоча
без мовы
і барані Божа ўздымацца
ўвысь
па драўлянай лесвіцы:
зваротнай дарогі
не пазбегнуць
ты зорка, і я веру табе,
як веру маці
якая падае віно са стала
Нерона
бо ў моры спакою - ты зорка

## *Анжаліна ДАБРАВОЛЬСКАЯ*

***

Да ранка
дарую крыўды, -
мой вораг,
ці станеш сябрам?
Няхай самота закрые
Цябе ад бедаў-навалаў.
Да ранка
змайструю крылы,
сябе агалю да пёрка-
хай возьме іх той,
хто мілы,
і верыць у мяне, дзіцёнак.
І так,
без крылаў і крыўдаў,
акрыўшыся толькі ску-
рай,
пайду па зямлі астылай -
у свет ранішні,
заўтрашні,
судны.

*Ноч перад Змітравай*
*суботай, 1994 г.*

## *Мікалай СПОРНІК*

***

*Разбужен щедрой*
*мартовской капелью,*
*Растерянным мальчишкой*
*на снегу*
*Стою и слышу,*
*как в стволах запели*
*Березовые струны*
*сквозь пургу.*
*Весна! Какое милое*
*названье!*
*И сквозь морозы*
*ласковым теплом*
*Расплавился холодный лед*
*изгнанья*
*Из юности,*
*оставшейся в былом;*
*Из трудных лет,*
*рожденных*
*сорок первым,*
*Упавших на заплатанную*
*шаль,*
*Завязанных одним единым*
*нервом*
*С названьем -*
*материнская печаль.*
*Печаль, как сны забытые,*
*- в забытом,*
*Как соль земли -*
*в разбуженных*
*сердцах,*
*Летящих к*
*неизведанным*
*орбитам*
*На материнских*
*поднятых*
*руках.*

## *НІКОЛЬ, 8 гадоў*

**Времена года**

### Весна

Пришла весна. Еще
холодновато,
Но скоро птицы снова
прилетят.
Пришла весна, и значит,
снова надо
Нам веселиться, прыгать
и играть.

### Лето

Нам солнце ярко светит,
Для нас цветут цветы.
И радуемся лету
И он, и я, и ты!

### Осень

Идет осенний грустный
листопад,
Деревья голые почти стоят...
И грустно нам идти гулять,
И нет уже цветов,
И жаль нам осень
провожать, -
Грядет пора снегов.

### Зима

Уже пришла зима,
На лужицах ледок,
Нахохлились синички
И сыплется снежок.



**Вершы друкуюцца на мове арыгінала**



## Віншуем з нагоды юбілею !

**ЛЕЦКА Ксенафонта Іванавіча**, дацэнта, загадчыка кафедры беларускай літаратуры - з 55-годдзем.

**ІВАНОВА Яўгена Яўгенавіча**, дацэнта кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі - з 40-годдзем.

**ВУВУНІКЯНА Юры Мкіртычавіча**, дацэнта кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу - з 50-годдзем.

**ЯРМУСІКА Эдмунда Станіслававіча**, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі -з 40-годдзем.

**БЕЛАВУСАВУ Алену Васілеўну**, дацэнта кафедры філасофіі - з 50-годдзем.

**КІРВЕЛЯ Часлава Станіслававіча**, загадчыка кафедры філасофіі - з 50-годдзем.

**ІВАНОВА Віктара Аляксандравіча**, старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання - з 40-годдзем.

**БЯЛЫХ Святлану Мікалаеўну**, старшага выкладчыка кафедры філасофіі - з 40-годдзем.

**ЖУК Галіну Яўгенаўну**, лабаранта І катэгорыі кафедры дыферэнцыяльных ураўнаванняў - з 50-годдзем.

**РЫЧКОВУ Людзмілу Васілеўну**, дацэнта, дэкана факультэта замежных моваў - з 40-годдзем.

**ІВАНЧУКА Барыса Міхайлавіча**, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі - з 60-годдзем.

**САПЕШКА Гелену Станіславаўну**, прыбіральшчыцу вучэбнага корпусу N 5 -з 65-годдзем.

**АЎХІМЕНЮ Міхася Аляксеевіча**, старшага выкладчыка кафедры музыкі і методыкі музычнай адукацыі - з 40-годдзем.

**ВІННІКАВА Аляксандра Васілевіча**, рабочага вучэбнага корпусу N 6 - з 50-годдзем.



**- Ды ніхто нас не абкрадаў! Проста я вырашыў падарыць табе французскія духі...**

## АБ'ЯВЫ

Гродзенскае аддзяленне Беларускага літаратурнага саюза «Полацкая галіна» запрашае літаратараў-пачаткоўцаў, якія пішуць на рускай мове, 10 сакавіка ў 18 гадзін ў гарадскую бібліятэку імя А. Макаёнка на арганізацыйнае пасяджэнне. Плануецца праводзіць сустрэчы ў другую пятніцу кожнага месяца.

Шукаю кампаньёна (пажадана з машынай) для сумеснай апрацоўкі дачнага ўчастка ў раёне в. Горніца. З прапановамі звяртацца ў пакой N 223 да Людзмілы Фёдараўны.

## СМЯЕМСЯ РАЗАМ

- Чаму я толькі не паслухалася маці і выйшла за цябе замуж?

- Ты хочаш сказаць, што твая маці раіла цябе не выходзіць за мяне замуж?

- Так.

- Божухна, як я памылялася ў гэтай жанчыне!

☺ ☺ ☺

Прыходзіць жанчына да доктара:

- Доктар, скажыце, да якога віду звяроў я адношуся?

- Што вы, жанчына, вы - чалавек!

- Ды не. Зранку ўстаю, як певень. На заводзе працую, як ішак. Бегаю па крамах, як сабака-сышчык. Дамоў іду, як вярблюд. У хаце кручуся, як вавёрка ў коле. Муж прыходзіць: «Дай паесці, кісанька». Кладуся адпачываць, а муж кажа: «Адсунься, развалілася, як карова». Дык які ж я чалавек?..

☺ ☺ ☺

- Мяне неаднаразова прасілі выйсці замуж.

- Хто?

- Бацька з маці.

☺ ☺ ☺

Размаўляюць дзве сяброўкі:

- Ты ведаеш, я страціла вагу на пяць кілаграмаў!

- А ўзважвалася ты з касметыкай ці без яе?

☺ ☺ ☺

Выкладчык спазніўся на працу на дзве гадзіны. Загадчык кафедры пытаецца:

- Чаму спазніўся?

- Жонка пяць тысяч згубіла.

- Ну і што?

- Яна іх шукала.

- А ты пры чым?

- Я на іх стаяў.

☺ ☺ ☺

- Дзядуля, чаму старажытныя грэкі заўсёды ўяўлялі Перамогу ў вобразе жанчыны?

- Даведаешся, калі ажэнішся, унучак!

☺ ☺ ☺

- Уяві сабе, Рышард, днямі я прачытаў дзесьці, што на востраве Барнэа жонка выконвае ўсю хатнюю працу, апрацоўвае ўчастак, выхоўвае дзяцей, корміць мужа і ўвогуле майстар на ўсе рукі. І такую жанчыну можна купіць за дваццаць долараў. Гэта жахліва!

- Чаму жахліва? Добрая жонка і каштуе дорага.

☺ ☺ ☺

У час студэнцкіх канікулаў сустракаюцца два сябра. Адзін пытаецца:

- Ну як адпачываецца, што новенькага? Ці ажаніўся ты са сваёй Аленай альбо ўсё яшчэ сам сабе гатуеш?

- І тое, і другое, - хмурна адказвае малады муж.

☺ ☺ ☺

- Нават не ведаю, які падарунак зрабіць сваёй жонцы да 8 Сакавіка, каб ён быў не вельмі дарагі і каб адначасова яе абрадаваў.

- Напішы ёй ананімны любоўны ліст!

**Рэдактар Н.КРАСНІЦКАЯ.**
**Камп'ютарная вёрстка А.СЯМЁНАЎ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не паздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём - 1 друк. арк.
Здана ў набор 3.03.95г.
Заказ 929
Наклад 700 асобнікаў.

Газета набрана і зверстана на камп'ютарнай тэхніцы выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйнёнай друкарні, Гродна, вул. Паліграфістаў, 2.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоная Рада універсітэта,прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.